Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

№11 (197). 15 — 21 сакавіка 2001г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 120 руб.

У аўторак, 13 сакавіка, у слонімскім РДК адбудзецца канцэрт вядомай беларускай спявачкі Іны Афанасьевай. Інтэрв'ю з артысткай чытайце

НА 8 СТАРОНЦЫ.

Чыноўнікі павінны атрымліваць заробак у апошнюю чаргу альбо Пра крызіс бясплатнай медыцыны

Фота Віталя Гіля

13 сакавіка ў актавай зале Слонімскай райбальніцы было цесна ад людзей. Медыкі сабраліся на сход, каб у дыялогу з уладамі абмеркаваць свае праблемы, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Аднак ніхто з прадстаўнікоў улады ў чарговы раз "не выйшаў да народа": ні з гар, ні з райвыканкама, хаця напярэдадні была дамоўленасць з канкрэтным чыноўнікам, што ён будзе прысутнічаць і адкажа на пытанні людзей у белых халатах.

(Працяг на 2 стр.)

СЕМЕН ДОМАШ О ПОЛИТИКЕ И НЕ ТОЛЬКО...

— Как думаете, Семен Николаевич, пустят вас на белорусское телевидение?

Домаш засмеялся. Я тоже.

Глупо задавать вопрос, ответ на который ясен. Вот история с чигиревским сыном — который день Михаила Николаевича из-за нее на БТ "полощут", а дали ему хоть слово сказать в ответ? То-то... Почему Домаш на иное отношение должен рассчитывать? Он сейчас с Чигирем и Гончариком в одной категории — презренные негодяи, посмевшие заявить, что на президентских выборах намерены спорить с самим Александром Григорьевичем. Уже поэтому подлежат команде "Мочить в сортире!".

Семен Николаевич Домаш — бывший председатель Гродненского облисполкома. Единственный из губернаторов, открыто перешедший на сторону белорусской оппозиции. Один из возможных кандидатов от демократических сил на предстоящих президентских выборах.

Ладно, нечего ждать милостей от природы. Просто в такой ситуации газета "Рабочы" считает своим моральным долгом сделать то, что, по логике, должны сделать содержащиеся на деньги налогоплательщиков (и, следовательно, обязанные быть объективными) государственные СМИ: дать высказаться одному из потенциальных кандидатов на президентский пост. Почему именно Домаш, а не кто-то другой, не те же Чигирь или Гончарик? Ну, хотя бы потому, что Домаш просто менее известен: живет в Гродно, реже попадается на глаза журналистам...

Итак, включаем диктофон, а вы о моем собеседнике судите сами.

— И все-таки вас, Семен Николаевич, пока меньше других долбают. Как думаете — почему?

— Наверное, очередь не дошла. Или компромат еще не накопали. Они же прямого разговора боятся, предпочитают провокации исподтишка. А не найдут ничего — придумают.

— То есть, ударов ждете?

— Лично я по всем позициям чист. Ну, была история с домом, из-за которой мое имя долго трепали, но ведь обвинить в каких-либо допущенных мною нарушениях так и не смогли. (В бытность председателем Гродненского облисполкома Домаш со своей семьей по требованию органов КГБ и МВД, осуществлявших его охрану, переселился в дом, сдав при этом городу свою ранее приватизированную квартиру. Когда Лукашенко избавлялся от чиновников, на которых не мог рассчитывать лично, эта история Семену Николаевичу была поставлена в вину. И хотя выяснилось, что к самому Домашу претензий быть не может— шепоток остался: то ли он шубу украл, то ли у него украли... — Ред.) Нет, честное слово, если опять историю с домом выволокут, можно только радоваться — значит, все в порядке, ни по мне, ни по моим родственникам больше зацепиться ни за что не смогли. И придется им что-то из пальца высасывать. А я... Мне за свою жизнь не стыдно.

(Продолжение на 5 стр.)

НАВІНЫ

Люди отказываются от оружия

11 единиц оружия уже сданы в Гродненской области в ходе месячника добровольной сдачи огнестрельного, газового оружия и взрывных веществ. Месячник продолжится до 20 марта.

Среди добровольно сданного оружия — 5 единиц гладкоствольного оружия, 5 — газового и один нарезной ствол. Также жители области сдали в органы милиции 75 штук боеприпасов.

В ходе оперативных действий милиционерами были конфискованы 7 единиц оружия и 70 патронов.

На сегодняшний день только в Гродно владельцами оружия являются около 4 тысяч человек.

Долларов не нашлось, отдали бананами

Руководство Гродненского зоопарка планирует приобрести первого в истории этого заведения австралийского кенгуру.

С этой целью на территории зоопарка была проведена однодневная акция по сбору средств "Наш любимый зоопарк". Посетителям, получившим право бесплатного посещения, предлагалось пожертвовать деньги или принести с собой фрукты и овощи. Однако необходимых 400 долларов для приобретения кенгуру собрать не удалось. Были собраны 141 тысяча белорусских рублей, 137 бананов, 60 апельсинов, 4 киви, 91 буханка хлеба, 52 пачки печенья и 2,3 килограмма конфет. Собранное питание будет скормлено животным.

Директор зоопарка Целина Погерило отметила, что акции по сбору денежных средств будут продолжаться, и гродненцы обязательно увидят кенгуру.

Павел МОЖЕЙКО

ПРОГНОЗ ПОГОДЫ

по Гродненской ОБЛАСТИ

15-16 МАРТА облачно с прояснениями. Местами небольшие осадки, туман. Ветер западный, слабый. Температура воздуха ночью -3 — +2, днем +3 — +8.

Облгидрометеоцентр

"А НАВОШТА ТАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ?"

15 сакавіка — дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым, карэспандэнты "ГС" звярнуліся да слонімцаў з пытаннем: "Ці адчуваеце вы сябе абароненымі Канстытуцыяй РБ?"

Ахвотнікаў адказаць на гэтае пытанне аказалася няшмат. Самым распаўсюджаным сустрэчным пытаннем было: "А навошта тая Канстытуцыя?" І ўсе ж такі некаторыя спрабавалі выказаць сваю пазіцыю:

Андрэй Сідараў:

— Не, не адчуваю. Вы бы лепш такое пытанне задавалі: "А ці бычылі вы Канстытуцыю?"

Іна, *прадпрымальніца:*

— Вядома, не. Я, увогуле, не чытала яе.

Вольга, *настаўніца*, фатаграфавацца адмовілася:

— Ніякай абароны не адчуваецца. Законы могуць існаваць асобна ад людзей. У нас зараз Канстытуцыя — сама па сабе, а дзяржава — сама па сабе.

Яўген Крупіца, Максім Трацяк, *вучні гімназіі N1:*

— Не адчуваем. Нават не ведаем, чаму...

Людміла Пашкова, *прадпрымальніца:*

— Так, нейкую абарону адчуваю, хоць і не ведаю тэкст той Канстытуцыі.

Цікава атрымліваецца: людзі не бачылі, не чыталі Канстытуцыі, але адчуваюць сябе неабароненымі. І наадварот: не ведаючы асноўнага закона дзяржавы і свае правы, адчуваюць поўную абароненасць. Парадокс нейкі атрымліваецца...

ДАВЕДКА:

"Канстытуцыя (ад лац. - устанаўленне, пабудова), асноўны закон дзяржавы, які вызначае грамадскі лад, парадак і прынцыпы ўтварэння прадстаўнічых органаў улады, выбарчую сістэму, правы і абавязкі грамадзян.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, асноўны закон дзяржавы. Прынята 15.03. 1994 года на 13-й сесіі Вярхоўнага Савета РБ. 24.11.1996 года па ініцыятыве А. Лукашэнка быў праведзены рэферэндум, на падставе якога ў Канстытуцыю былі ўнесены істотныя змяненні і дапаўненні. Абноўлены тэкст дапаўнення набыў сілу 27.11. 1996. Канстытуцыя складаецца з прэамбулы, 9 раздзелаў, у якіх 8 частак і 146 артыкулаў. Артыкул І падкрэслівае, што РБ — унітарная дэмакратычная, сацыяльна-прававая дзяржава, якая валодае ўсёй паўнатой улады на сваёй тэрыторыі і самастойна ажыццяўляе ўнутранную і знешнюю палітыку. Чалавек з'яўляецца найвышэйшай каштоўнасцю грамадства і дзяржавы".

Вольга ШЫНКЕВІЧ, Віталь ГІЛЬ (фота)

НАВІНЫ

Переходим на "летнее" время

25 марта 2001 года в два часа на всей территории Беларуси переводятся стрелки часов на 1 час вперед.

Тэатр гастралюе на Гомельшчыне

Слонімскі беларускі драматычны тэатр гастралюе па гарадах Гомельскай вобласці.

Са спектаклем "Іван Світаннік" знаёмяцца юныя гледачы Рагачова, Светлагорска, Рэчыцы і Жлобіна.

Сяргей ЧЫГРЫН

Пераможцы на баскетбольнай пляцоўцы

Днямі ў гарадскім спарткомплексе Слоніма прайшлі спаборніцтвы сяроду мужчын па баскетболу, якія праводзіліся ў рамках раённай працоўнай спартакіяды.

Сярод дзевяці каманд-удзельніц вызначылася тройка прызёраў. Імі сталі каманды саўгаса "Слонімскі" (1-е месца), Жыровіцкага агратэхнічнага каледжа (2-е месца) і калгаса імя Суворава (3-е месца). Каманда-пераможац атрымала права абараняць гонар Слонімскага раёна на абласных спаборніцтвах.

Валерый КАВАЛЕНКА

Прайшоў беларускі тыдзень

У трэцяй гарадской школе закончыўся тыдзень беларускай літаратуры.

Вучні пятых-адзінаццатых класаў мелі сустрэчы з мясцовымі літаратарамі, самі ладзілі беларускія вечарыны і знаёміліся з багаццем роднае мовы.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЧЫНОЎНІКІ ПАВІННЫ АТРЫМЛІВАЦЬ ЗАРОБАК

у апошнюю чаргу альбо Пра крызіс бясплатнай медыцыны

(Працяг. Пачатак на 1 стр.)

Сход адкрыла старшыня прафкама работнікаў слонімскага тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання (ТМА) Таццяна Кажанкова. Яна коратка нагадала пра мэту сходу. А менавіта, дамагчыся ад уладаў належнага фінансавання слонімскай медыцыны. Паколькі з прадстаўнікоў улады нікога не было, то хутка старшыня прафкама перадала слова выконваючаму абавязкі галоўнага ўрача мясцовага ТМА доктару Георгію Лабовічу. Георгій Аляксандравіч пачаў размову з запазычанасці па зарплаце, якую медыкам затрымліваюць з лютага, і паведаміў, што на пасяджэнні гарвыканкама грошы паабяцалі выплаціць да канца бягучага тыдня (да 16 сакавіка). Ён заверыў калег, што сам атрымае зарплату апошнім. Аднак нерэгулярная і невялікая зарплата — гэта толькі вяршыня айзбергу праблем медыкаў. Не хапае грошай на рамонт медыцынскіх устаноў, на нармальную працу дапаможных службаў, на набыццё і рамонт медыцынскага абсталявання, тэрміны эксплуатацыі якога даўно выйшлі, і многія прыборы знаходзяцца ў аварыйным стане. Няма за што набыць... элементарную пасцельную бялізну і новую бальнічную вопратку для хворых, халаты для саміх медыкаў. Дайшло да таго, што няма за што купляць патрэбныя лекі. Слонімскае ТМА фінансуецца з мясцовага бюджэту, у якім катастрафічна не хапае грошай не толькі на медыцыну. Аднак, як адзначыў Георгій Лабовіч, падобная сітуацыя і ў іншых медыцынскіх аб'яднаннях Гродзеншчыны.

Да ўдзельнікаў сходу звяртаецца выконваючы абавязкі галоўнага ўрача Слонімкага ТМА Георгій Лабовіч

Фота Віталя Гіля

Есць над чым задумацца

Фота Віталя Гіля

Пасля Лабовіча присутныя захацелі пачуць свайго калегу, дэпутата абласнога Савета дэпутатаў Генадзя Урбановіча. Апошні сказаў, што ў дыялогу з уладамі трэба паводзіць сябе карэктна. На пытанне з залы: "Як карэктна?", — Генадзь Урбановіч удакладніў, што трэба пастаянна звяртацца ў гар і райвыканкамы, прасіць датацый з абласнога бюджэту, дабівацца ўвядзення элементаў платнай медыцыны, у першую чаргу... для работнікаў выканкамаў. На заўвагі з залы, што дэпутаты ўсіх узроўняў нічога не робяць, каб вырашыць праблемы ў сферы аховы здароўя, Урбановіч адказаў, што мясцовыя і абласныя дэпутаты практычна нічога не вырашаюць, бо Саветы не маюць сродкаў, а самі слугі народа працуюць "на грамадскіх пачатках". Сапраўды, рэальнай уладай у нашай краіне з'яўляецца толькі выканаўчая.

Аб набалелых праблемах медработнікі выказваліся досыць рэзка. У канцы сходу было вырашана паслаць у слонімскі "белы дом" рэзалюцыю з патрабаваннямі наступнага зместу:

"Рэзалюцыя сходу працоўнага калектыву ўстановы аховы здароўя "Слонімскае ТМА" 13.03.2001г.

На сённяшні дзень у ахове здароўя горада і раёна склалася катастрафічная сітуацыя з-за крэдытарскай запазычанасці, якая на 5.03.2001г. раўняецца 210287600 руб. Па гэтай прычыне медаб'яднанне не можа набыць самае неабходнае: медыкаменты, шпрыцы, перавязачны матэрыял, сродкі дэзынфекцыі, спірт, не кажучы ўжо пра лабараторныя рэактывы, неабходнае абсталяванне і мяккі інвентар. У сувязі з гэтым адмяняюцца планавыя аперацыі, медработнікі не могуць у поўным аб'ёме аказваць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу насельніцтву, падтрымліваць неабходны санітарна-эпідэміялагічны рэжым, што ставіць пад пагрозу жыццё і здароўе людзей.

Узрастае сацыяльная напружанасць у калектыве, выкліканая затрымкамі і без таго нізкай зарплаты, маральнай і юрыдычнай адказнасцю за сваю прафесійную бездапаможнасць, негатыўнымі адносінамі насельніцтва, якое толькі ў асобах медыцынскіх работнікаў бачыць вінаўніка ўсіх бедаў.

Здароўе народа — асноўнае багацце нацыі, таму сёння мы, медыцынскія работнікі, не маем права маўчаць.

ЛІЧЫМ НЕАБХОДНЫМ:

1. Тэрмінова разгледзець на пасяджэннях Слонімскіх гар і райвыканкамаў пытанні фінансавання аховы здароўя.

2. Перагледзець бюджэт на 2001г. У прыватнасці сродкі, накіраваныя на фінансаванне футбольнай каманды і на розныя забаўляльныя мерапрыемствы, перадаць на ахову здароўя людзей.

3. Абавязковая прысутнасць на медыка-санітарных саветах прадстаўнікоў дэпутацкага корпусу і гарвыканкама.

4. Прэарытэт у чарговасці выплаты заробку аддаць работнікам аховы здароўя, адукацыі, культуры. Работнікам гарвыканкама зарплату выплочваць у апошнюю чаргу."

... Такі вось канец цытаты. І такая яна наша бясплатная медыцына.

Мікола КАНАНОВІЧ

СТАЛИ ДЕЙСТВОВАТЬ НОВЫЕ ПРАВИЛА

11 марта вступил в силу новый порядок перемещения через границу Беларуси резидентами и нерезидентами товаров не для коммерческих целей.

Согласно утвержденному положению, при ввозе-вывозе товаров не для коммерческих целей физическим лицам предоставляется ряд льгот по уплате таможенных платежей. Так, при ввозе физическими лицами личного имущества общей стоимостью до 1000 долларов США, уплата таможенных платежей не требуется. При этом следует иметь в виду, что в составе такого имущества учитываются и ограниченные к ввозу товары. Это, в частности, не более 3 литров алкогольных напитков, 200 штук сигарет либо 200 граммов табака или иных табачных изделий, 5 единиц ювелирных изделий, не более 3 предметов одежды из натуральной кожи и (или) меха, 1 единицы видеозаписывающей или видеовоспроизводящей аппаратуры на одного человека. Поэтому в случае ввоза физическими лицами личного имущества, в состав которого будут входить указанные товары, уплаты таможенных платежей не потребуется, если общая таможенная стоимость такого имущества не превысит суммы, эквивалентной 1 000 долларов США. Если же общая таможенная стоимость имущества превысит 1 000 долларов США, то необходимо будет уплатить таможенные пошлины и налоги по единой ставке 30 процентов от таможенной стоимости имущества.

Личное имущество, ввозимое в адрес физического лица посредством международных почтовых отправлений, полностью освобождается от уплаты таможенных платежей, если таможенная стоимость этого имущества эквивалентна сумме до 100 долларов США. При этом имущество, ввозимое иным способом в адрес физического лица, не выезжавшего за пределы Беларуси, облагается таможенными пошлинами и налогами по единой ставке 30 процентов.

Запрещается пересылка в Беларусь алкогольных и табачных изделий в международных почтовых отправлениях. Однако пересылка таких изделий из Беларуси в международных почтовых отправлениях допускается.

БелаПАН

ПОШТА

Как можно выехать в Англию на заработки?

Здравствуйте, уважаемая редакция "ГС"!

Написать вам меня побудил небольшой вопрос. Сегодня многие ездят за границу для того, чтобы заработать деньги. Учитывая наше знание английского языка, мы с другом решили поехать в Англию.

Может, вы сможете прояснить некоторые вопросы. Нам хотелось бы узнать, как дорого стоит рабочая виза в эту страну? Что необходимо для ее получения? Можно ли, договорившись о работе с гражданином Англии, как частным лицом, устроиться к нему работать по рабочей визе? Может, вам знакома организация, которая помогла бы нам в трудоустройстве на время в данной стране?

В любом случае, спасибо.

С уважением Сергей и Руслан из г. Слонима

Корреспондент "ГС" связалась с посольством Великобритании в Беларуси и попросила ответить на интересующие наших читателей вопросы. Однако, распространением такой информации не по телефону занимается консульский отдел посольства. Поэтому за подробностями обращаться следует по адресу: 220030, Минск, ул. К. Маркса, 37.

ЗДАРЭННІ

Переиграл

В Гродно возбуждено уголовное дело в отношении главного режиссера Гродненского областного драматического театра Сергея Полещенкова. Он обвиняется в хулиганстве.

22 февраля вечером в кафе на улице Дзержинского он был уличен в непристойном поведении, а потом дерзко избил сотрудницу кафе.

Начальник управления культуры Гродненского областного исполнительного комитета Людмила Кадевич "попросила" Сергея Полещенкова написать заявление об увольнении с работы по собственному желанию.

Павел МОЖЕЙКО

Харакіры па-слонімску

21-гадовая сланімчанка пры невядомых абставінах прымяніла метад японскіх самураяў.

Нажом яна ўспарола сабе жывот. Пацярпеўшая дастаўлена ў хірургічнае аддзяленне бальніцы.

Абрабавалі касцёл

Рабаўнікі залезлі ў касцёл, што на вуліцы Войкава ў Слоніме.

Адтуль яны ўкралі мікрафон, узмацняльнік і іншыя рэчы.

Зніклі ядахімікаты

У калгасе "Чырвоны партызан" невядомыя ўкралі ядахімікаты, якія складзіраваліся каля вёскі Вішава.

Міліцыя шукае злодзеяў.

Згарэў дом

У жыхара Сельскай вуліцы г.Слоніма Пятра Я. згарэў дом.

Прычыны пажару высвятляюцца. З агню ўдалося ўратавацца гаспадару дома, а таксама выкаціць машыну і выцягнуць хатнюю жывёлу.

Пажар у Жыровічах

12 сакавіка ў тры гадзіны ночы ў пажарную службу паступіла інфармацыя, што ў Жыровічах гарыць інтэрнат сельскагаспадарчага каледжа.

Сапраўды, у інтэрнаце №2 гарэў адзін пакой, які падпаліў беспрацоўны Ігар В. Міліцыя яго затрымала. Пажар удалося патушыць, але ў агні згарэла ўся мэбля і асабістыя рэчы жыхароў.

Сяргей ЧЫГРЫН

Спрытны інвалід

Мастаўчанін М., які кіраваў аўтамабілем, учыніў аварыю ды спрабаваў з'ехаць з месца здарэння, але быў затрыманы супрацоўнікамі ДАІ.

Інспектары былі шчыра здзіўлены, бо парушальнікам аказаўся п'яны інвалід.

Антон МАКЕЙ

Врача убили в гараже

В Гродно была задержана 17-летняя девушка, жительница деревни Першаи Воложинского района Минской области. Она подозревается в убийстве врача детского отделения Гродненской областной больницы.

Труп врача был обнаружен в субботу, 10 марта, в гараже убитого по улице Краснопартизанской в Гродно. Судмедэксперты зафиксировали множество кровоподтеков на теле убитого, выбитые зубы, на шее был затянут галстук. Родственники убитого заявили, что исчезли наручные часы швейцарского производства, зажигалка "Зипо", сотовый телефон и автомагнитола "Кенвуд". При задержании у девушки была обнаружена пропавшая автомагнитола.

Павел МОЖЕЙКО

ІНТЭРВ'Ю

АНАТОЛЬ ПАТОЦКІ: "Я пачаў сваю новую кар'еру з дысцыпліны"

Фота Віталя Гля

Як пісала наша газета, у калгасе "Перамога" Слонімскага раёна замест Аляксандра Рахунка людзі аднагалосна выбралі новага кіраўніка гаспадаркі 43-гадовага Анатоля Патоцкага.

Да гэтага ён працаваў намеснікам старшыні калгаса "1 Мая". Сёння са спадаром Патоцкім гутарыць карэспандэнт "ГС".

— Анатоль Лявонцьевіч, скажыце некалькі слоў пра сябе.

— Я родам со Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, працаваў аграномам на Гомельшчыне, пасля прыехаў на Слонімшчыну. Любоў да зямлі мне прывілі мой дзядуля, які навучыў і за плугам хадзіць, і стажкі класці.

— З чаго Вы пачалі першыя працоўныя дні на новай пасадзе?

— З дысцыпліны. Гэта па-першае. Па-другое, трэба павышаць культуру земляробства. Калі ёсць аддача ад зямлі, тады ёсць і грошы. А за грошы можна купіць тэхніку, будаваць жыллё, плаціць людзям добрую зарплату. Бо як сёння пражыць калгаснiку, які атрымлівае ў месяц па 10-15 тысяч рублёў?

— У якім эканамічным стане знаходзіцца цяпер калгас "Перамога"?

— У даволі цяжкім. Няма запасаў фуражу, не хапае кармоў для жывёлы. У выніку надоі нізкія, прывагі таксама. Будаўнічай брыгады няма. Ведаеце, няма нават звычайных дошак...

— Якія першыя даручэнні непасрэдна ад Вас атрымалі калгасныя спецыялісты?

— Галоўныя спецыялісты ў гэтым калгасе не мелі самастойнасці, ініцыятывы. Выконвалі тое, што ім казаў старшыня. Цяпер будзе інакш. Галоўны спецыяліст, які ўзначальвае тую ці іншую галіну вытворчасці, будзе несці поўную адказнасць за даручаную справу, самастойна вырашаць сваю задачу. Напрыклад, загадчык фермы будзе адказваць за стан фермы, рост вытворчасці прадукцыі і г.д. Людзям даецца шанц паказаць свой талент і сваю працоўную ініцыятыву. Будзе станоўчы вынік – будзе заахвочвацца спецыяліст і людзі, з якімі ён працуе. А калі не – мы развітаемся.

— Анатоль Лявонцьевіч, у калгасе "1 Мая", дзе Вы працавалі, фінансавае і эканамічнае становішчы, відаць, лепшыя, чым у калгасе "Перамога"?

— Я думаю – так. Там ёсць дысцыпліна і парадак. Старшыня калгаса Антон Дабрэнка аказаў нават невялікую дапамогу: выдзеліў калгасу "Перамога" пяць тон сена па бартэру.

— Як Вы развіталіся з Антонам Дабрэнкам, з пераходам на працу ў суседні калгас?

— Была шчырая і дабразычлівая размова. Ён сказаў, што мне трэба "расці"... За дапамогу, за парады я ўдзячны Антону Станіслававічу.

Сяргей ЧЫГРЫН

ОЧИСТИМ НЕМАН ОТ ГРЯЗИ

Первый заместитель министра природных ресурсов и охраны окружающей среды Беларуси Игорь Войтов отправился в Брюссель для участия в трехдневном заседании комитета тендера Европейской комиссии по проекту ТАСИС "Улучшение качества поверхностных вод в бассейне реки Неман в Гродненской области за счет уменьшения их загрязнения отходами промышленных и сельскохозяйственных производств".

Как сообщил БелаПАН директор Центра подготовки и реализации инвестиционных проектов Минприроды Николай Цыганков, в тендере примут участие четыре консорциума из Великобритании, Германии и Дании. Реализация этого грантового проекта стоимостью в 1,7 миллиона евро, по его словам, начнется в апреле, когда в Беларусь приедут иностранные эксперты. При этом 400 тысяч евро будут выделены для финансирования двух пилотных подпроектов по полной реконструкции очистных сооружений одного промышленного и одного сельскохозяйственного предприятия Гродненской области. Остальные средства, по словам Цыганкова, будут направлены на строительство в Гродно офиса управления проектом, проведение двух обучающих зарубежных семинаров для нескольких десятков белорусских специалистов, привлечение иностранных экспертов для оказания помощи научным учреждениям, а также обследования всего бассейна Немана для выявления источников загрязнения.

Как отметил Цыганков, главная задача данного проекта, рассчитанного на два года, открыть перспективу для строительства очистных сооружений на тех предприятиях, которые наиболее загрязняют окружающую среду.

БелаПАН

ПРИНЯЛИ РЕШЕНИЕ ЗА "КРУГЛЫМ СТОЛОМ"

Ряд молодежных организаций Гродно приняли решение о полной координации своих действий накануне избирательной президентской кампании 2001 года.

Это решение – результат заседания "круглого стола" на тему "Проблемы деятельности молодежных организаций в ходе избирательной кампании", который состоялся в областном центре 9 марта. В нем принимали участие представители "Маладога Фронту", "Маладой Грамады", "Молодежи ОГП", "Альянса имени Витовта Великого", "Свободного профсоюза студентов" и организации "Краявід". Инициатором мероприятия выступила гродненская организация "Маладога Фронту".

Были обсуждены такие актуальные проблемы, как нескоординированность действий организаций, информационный вакуум, замкнутость активной молодежи в своих организациях и другие. Участники "круглого стола" приняли решение о координации усилий своих организаций по призыву молодежи Гродно участвовать в выборах и по планированию в городе массовых акций. Разработан план совместных мартовских мероприятий. Ближайшими акциями станут общегородские литературные молодежные чтения, антифашистский пикет 18 марта, а также широкое участие в праздновании в Гродно 25 марта Дня Воли.

Павел МОЖЕЙКО

Дояркам денег не хватило

1 миллиард 571 миллион рублей составила на начало марта сумма задолженности по заработной плате на предприятиях Гродненской области.

Об этом сообщил заведующий информационно-аналитического отдела комитета Госконтроля по Гродненской области Александр Авсейчик.

По сравнению с данными на 1 февраля задолженность по зарплате в области увеличилась почти в два раза. 78 процентов от всей суммы приходится на сельскохозяйственные предприятия, 16 процентов – на промышленность.

В "передовиках" по невыплате заработной платы находится Лидский район – задолженность 206 миллионов рублей. Не намного отстают Ивьевский и Островецкий районы – 136,7 и 131,6 миллиона невыплаченных рублей соответственно.

Подана заявка на митинг

Оргкомитет по празднованию в Гродно Дня Воли, куда вошли представители БНФ, Белорусской социал-демократической Грамады, "Маладога Фронту", "Маладой Грамады" и "Молодежи ОГП", подали в горисполком заявку на проведение праздничного митинга.

Предполагаемое количество его участников – 1000 человек. Организаторы планируют, что митинг состоится в воскресенье, 25 марта, с 14 до 16 часов в центре Гродно – на площади Ленина, недалеко от зданий горисполкома и облисполкома.

Павел МОЖЕЙКО

НАВІНЫ

Праблемы Маліноўскага

Волею райвыканкама, а не сходам калгаснікаў, пазбаўлены пасады старшыня калгаса імя Адама Міцкевіча Браніслаў Маліноўскі. Ён адпраўлены ў адпачынак.

Дакладна нявядома, за які ўчынак Браніслаў Маліноўскі трапіў у няміласць раённага кіраўніцтва. Згодна афіцыйнай версіі: за зніжэнне вытворчых паказчыкаў, хоць калгас лічыцца адным з лепшых у раёне. Абавязкі кіраўніка гаспадаркі пакуль выконвае галоўны аграном Алег Майзік.

Непаслухмяны старшыня сельсавета пакараны

Вызвалены ад пасады старшыня Дубнаўскага сельсавета Мікалай Кузьміцкі.

Для апошняга гэта не было нечаканасцю. Не падабаўся ён раённаму кіраўніцтву за сваю рэзкасць у выказваннях і меркаваннях. Раней ён быў дэпутатам райсавета і на грамадскіх пачатках абіраўся намеснікам старшыні райсавета. Зараз Мікалай Кузьміцкі працуе ў калгасе "Дубна" намеснікам па камерцыі.

Антон МАКЕЙ

"Надвор'е ў доме" цудоўнае

У Жаночы дзень 8 сакавіка ў раённым Доме культуры прайшоў заключны этап конкурсу-агляду сямейных пар Мастоўскага раёна пад назваю "Надвор'е ў доме".

Яму папярэднічалі куставыя спаборніцтвы, дзе было вызначана пяць лепшых сем'яў. Яны прадстаўлялі розныя рэгіёны Мастоўшчыны. Гэта людзі розных спецыяльнасцей і прафесій: настаўніца, трактарыст, работнікі культуры і міліцыі. Ім была прапанавана даволі разнастайная праграма спаборніцтваў. Скажам, мужчыны павінны былі згатаваць салату, а жанчыны – завязаць гальштук, станцаваць пад незнаёмую музыку ці паказаць статую кахання. Ад удзельнікаў спаборніцтва патрабавалася пэўная доля фантазіі, спрыт ды паэтычны талент. Перапынкі між конкурсамі ўдала запаўняліся музычнымі нумарамі. Строгае журы, да складу якога належалі старшыня райвыканкама Аляксандр Кісялёў, яго намеснік Таісія Мурына, загадчык аддзела культуры Уладзімір Свістуноў, сакратар БПСМ Андрэй Рахунок і яшчэ некалькі адказных райвыканкамаўскіх супрацоўнікаў, вызначыла пераможцаў. Першае месца заслужана заняла сям'я Лагодскіх з Харціцкага сельсавета. Ім дастаўся прыз сімпатый гледачоў. Пераможцы атрымалі дыван. Дываны атрымалі таксама і прызёры, але меншых памераў. Сямейныя пары, якія занялі чацвёртае і пятае месцы, былі ўзнагароджаны прасамі.

Язэп ПАЛУБЯТКА

У Мастах будзе шмат рыбы

Для паляпшэння забеспячэння мастаўчан рыбаю на тэрыторыі раёна ў апошні час створаны тры фермерскія гаспадаркі, якія будуць непасрэдна займацца развядзеннем і продажам рыбы. Да гэтага на працягу некалькіх дзесяткаў гадоў свежую рыбу ў крамы Мастоўшчыны пастаўляла рыбалавецкая брыгада калгаса імя Чапаева. І паколькі промысел ішоў на рацэ Нёман, то колькасць вылаўленай рыбы ў некаторай ступені залежала ад рыбацкага шчасця.

Антон МАКЕЙ

ФЕЛЬЕТОН

Працоўныя спрэчкі

"Святая прастата", — казалі старажытныя грэкі пра недасведчаных людзей. Але і сучасныя гаспадары, і кіраўнікі прадпрыемстваў вельмі спрытна ўмеюць карыстацца недасведчанасцю сваіх работнікаў. А калі з часам работнік становіцца дасведчаным, то ўзнікаюць праблемы. І нават судовага характару.

Вось і на адным са слонімскіх аўтапрадпрыемстваў адміністрацыя доўгі час не даплачвала... свайму эканамісту.

Лідзія Іванаўна на МАТП (колішняя восьмая аўтабаза) працуе з 1984 года. Інжынер-эканаміст па адукацыі, яна прыйшла на новае месца працы, ужо маючы вопыт работы ў аўтатранспартных прадпрыемствах. Жанчыну атэставалі на пасаду эканаміста па планіраванню першага разрада. Асноўным яе абавязкам спачатку было налічэнне зарплаты вадзіцелям. І пра тое, як налічаецца заробак ёй самой (і навукова-тэхнічным работнікам увогуле), жанчына не ведала.

Ішоў час. З перабудовай прадпрыемства перайшло на гаспадарчы разлік. Праблем з кожным годам станавілася больш, а грошай — менш.

У 1999 годзе Лідзія Іванаўна засумнявалася, ці правільна ёй налічваюць заробак? Пачала ўдакладняць у адміністрацыі. Але аказалася, што такія звесткі для яе засакрэчаныя. Не паказалі ёй патрэбных дакументаў — і ўсё тут. У пошуках ісціны жанчына напісала ў розныя дзяржаўныя ўстановы, такія як Камітэт дзяржкантролю, Інспекцыю па працы і іншыя. І калі гэтыя афіцыйныя структуры пачалі праверку па скаргах Лідзіі Іванаўны, тады і высветлілася, што вялікага сакрэту тут не было. Проста пры налічэнні грошай за аснову браліся, як кажуць эканамісты, "не тыя пазіцыі". Фактычна заробак заніжалі. Афіцыйна стаўку першага разрада павялічылі, а неафіцыйна занізілі разам з прыслаўтым міжразрадным каафіцыентам. Маўляў, цяжкія справы на прадпрыемстве, трэба эканоміць...

І дурылі Лідзію Іванаўну на родным прадпрыемстве, як высветлілася, ажно з 1992 года. Зразумелым было жаданне жанчыны атрымаць праз суд розніцу за ўвесь гэты час. Але па закону пераразлік зрабілі толькі за апошнія тры гады: з 1997-га па 2000. Тэрмін даўніны спрацаваў.

У гэтай гісторыі ёсць яшчэ адна цікавая акалічнасць. За час працы Лідзіі Іванаўны на прадпрыемстве змянілася некалькі кіраўнікоў. Але пакуль справа не дайшла да суда, на парушэнні працоўнага заканадаўства кіраўніцтва глядзела праз пальцы. І калі "эканомілі" на эканамісту, то можна толькі здагадвацца, як там налічвалі заробак іншым.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЧТО ДУМАЕТ МОСКВА В ПРЕДДВЕРИИ ПРЕЗИДЕНТСКИХ ВЫБОРОВ В МИНСКЕ?

Российские спецслужбы активно изучают ситуацию в Беларуси, складывающуюся накануне президентских выборов, и изучают возможные сценарии развития событий, как в ходе президентской кампании, так и по ее завершении, утверждает "Белорусская газета" в статье "X-files: российский вариант".

По сведениям издания, в январе-феврале в Беларуси работала большая аналитическая группа специалистов из Совета безопасности и Федеральной службы безопасности России. По результатам этой работы был якобы подготовлен "Обзор политической и социально-экономической ситуации в Белоруссии", содержащий не только описание "проблемных зон" во внутренней белорусской политике, но и предлагающий практические выводы относительно того, чем та или иная позиция Кремля во время белорусской избирательной кампании 2001 года чревата для России в целом, а также, какую политику необходимо проводить официальной Москве по отношению к своему союзнику в этот период. В этой связи в статье приводятся выдержки из упомянутого обзора, характеризующие состояние оппозиции и властных структур: "...если растерянность широкого фронта оппонентов А.Г.Лукашенко связана, скорее всего, с отсутствием единого центра принятия решений накануне президентских выборов, то растерянность потенциальных сторонников Лукашенко сопряжена, скорее всего, с чрезвычайно агрессивной позицией последнего по целому ряду знаковых для элиты вопросов".

Авторы документа, как сообщает газета, констатируют, что "президент Белоруссии А.Г.Лукашенко не располагает реальным механизмом для проведения более или менее выдержанной в рамках формальной демократии избирательной кампании" и указывают Кремлю "на возможность и даже неизбежность организационных и технологических нарушений, которые будут предприняты нынешними белорусскими властями". Из этого "Белорусская газета" делает вывод о том, что официальная Москва уже практически признала возможную фальсификацию будущих президентских выборов в республике и задумывается, насколько подобные события в Союзном государстве осложнят отношения России с западными партнерами. По мнению россиян, указывает издание, если А.Лукашенко пойдет на фальсификацию выборов, то это дестабилизирует ситуацию в регионе и законсервирует белорусский кризис еще на 2–2,5 года, после чего можно будет ожидать крупный "социально-политический взрыв в Белоруссии".

Исходя из имеющихся в распоряжении редакции документов, издание делает весьма смелый вывод о том, что Кремль не рассматривает нынешнего белорусского президента в качестве "одного из возможных перспективных вариантов на президентских выборах" и сообщает, что, по его данным, часть российской политической элиты считает оптимальным развитием ситуации в республике "выборную схему, при которой А.Г.Лукашенко вообще не будет участвовать в избирательной кампании...", что возможно только гипотетически.

Поэтому, утверждает "Белорусская газета", Кремль и предлагает А.Лукашенко ряд основополагающих принципов двусторонних отношений, которые для него должны стать "священными" в преддверии выборов. По сведениям издания, на днях их привез в Минск специальный помощник госсекретаря Совбеза РФ Сергея Иванова. Среди этих основополагающих принципов "Белорусская газета" называет строгую привязку даты проведения выборов к Конституции, не направление А.Лукашенко своих представителей "для конфиденциальных бесед с российскими влиятельными финансистами", "не трогать тех белорусских предпринимателей, которые имеют отношение к российским транзитным, сырьевым и экспортно-импортным интересам". Президенту Беларуси не рекомендуется критиковать российские социально-экономические реалии, "особенно с отражением этого в местных средствах массовой информации", а также "несколько снизить агрессивную тональность внешнеполитических заявлений".

Некоторые аналитики, не отважившиеся оценивать степень достоверности приведенных "Белорусской газетой" сведений, сам факт появления публикации расценивают как реакцию на отсутствие до сих пор официальной позиции Кремля по отношению к президентским выборам в Беларуси и роли Александра Лукашенко в них. При этом они указывают на то, что, по имеющимся сведениям, данный вопрос может быть поднят в ходе личной встречи глав двух государств в Москве 2 апреля. Факт работы в Минске аналитиков российских спецслужб БелаПАН не подтвердили и не опровергли в пресс-службе Совета безопасности Беларуси – там об этом ничего не известно. Однако отметили, что, несомненно, российские власти и российскую политическую элиту интересует ситуация в Беларуси накануне предстоящих президентских выборов, и они ее изучают...

Олег СОКОЛОВ

ТАК ЧЕЙ ТОТ ГОЛОС?

В Гродно массово распространяется газета-листовка "Голос веры", на которой стоит штамп "Русское национальное единство" (РНЕ).

В ней содержится "Воззвание к белорусскому народу", в котором представители РНЕ протестуют против указания в белорусских паспортах пожизненного номера владельца. В выходных данных "Голоса веры" говорится, что листовка печатается в России, но молодые люди, раздающие газету около гродненского православного собора на улице Ожешко, утверждают, что это – издание епархии.

Гродненская епархия не имеет никакого отношения к изданию и распространению этой газеты, заверил православный священник отец Александр Велисейчик. "На территории нашей епархии издается только газета "Гродненские епархиальные ведомости", и еще одна наша община издает газету "Православный вестник", – сообщил отец Александр.

Павел ИВАНЕНОК

НАМЕЧАЕТСЯ ВИЗИТ ПАТРИАРХА

В конце июня ожидается визит в Беларусь патриарха Московского и всея Руси Алексия II.

Как сообщили БелаПАН в пресс-службе Белорусской православной церкви, это будет уже четвертый архипастырский визит патриарха Алексия по епархиям Беларуси. Первый раз Алексий II побывал в республике в 1991 году. Тогда он посетил юго-восточные епархии Белорусской православной церкви, второй раз – в 1995-м (западные епархии) и еще один раз – в 1998 году (северные епархии).

С приглашением посетить Беларусь к патриарху Московскому и всея Руси обратился Белорусский экзархат Русской православной церкви. Предполагается, что в ходе визита Алексий II освятит брестский храм-памятник в честь Воскресения Христова, посвященный победе советского народа в Великой Отечественной войне. Строительство этого храма, длившееся несколько лет, наконец завершено. Желание принять участие в его освящении Алексий II высказывал еще в период закладки храма.

Марат ГОРЕВОЙ

ХВАТИТ. ЗА УЧЕБУ ПОРА ПЛАТИТЬ

Постановлением Совета Министров внесены изменения и дополнения в "Положение о целевой подготовке специалистов", утвержденное 28 марта 2000 года.

В преамбуле документа отмечается, что изменения и дополнения вносятся с целью дальнейшего улучшения кадрового обеспечения отраслей экономики страны, реализации предложений Государственной комиссии по контролю за ходом вступительных экзаменов в государственных высших и средних специальных учебных заведениях.

Комментируя для БелаПАН внесенные изменения и дополнения, заместитель начальника отдела главного управления высшего и среднего специального образования Министерства образования Бронислав Дашкевич, в частности, отметил: для более полного удовлетворения потребности в специалистах регионов, пострадавших от чернобыльской катастрофы и населенных пунктов, в которых отсутствует подготовка кадров по необходимым для заказчиков специальностям, предполагается целевое направление абитуриентов в любой из вузов страны. "Если по окончанию учебы эти молодые специалисты не пожелают возвращаться в организацию, которая их направила для получения образования, или не отработают два года по направлению, они вынуждены будут оплатить полную стоимость обучения", – подчеркнул Дашкевич.

Вместе с тем, по его словам, приемные комиссии учебных заведений получают право окончательного решения об осуществлении приема абитуриентов по общему или отдельному конкурсу при отсутствии конкурса на конкретное целевое место.

Кроме того, отбор абитуриентов на целевую подготовку осуществляется по заявкам заказчиков из числа лиц, проживающих в регионах, пострадавших от чернобыльской катастрофы, или в иных населенных пунктах, где отсутствует подготовка необходимых для заказчика специалистов, сказал Бронислав Дашкевич. При этом, по его словам, абитуриенты должны окончить учебное заведение и проживать в одном из названных населенных пунктов и иметь в документе о среднем образовании по профильным предметам вступительных экзаменов оценки "4" или "5".

БелаПАН

НАПИШИТЕ АВСТРАЛИЙСКИМ ШКОЛЬНИКАМ

Австралийские школьники из города Парквилль заинтересовались жизнью сверстников в Беларуси. Об этом БелаПАН сообщила руководитель информационного центра Белорусского национального молодежного совета Диана Маневская.

По ее словам, школьники из Австралии интересуются школьными системами образования в разных странах мира, в том числе, и Беларуси. В свою очередь, белорусские дети, по мнению Маневской, могут использовать эту инициативу для установления международных контактов со своими заокеанскими сверстниками.

Австралийских школьников интересует информация о конкретных белорусских школах и, в частности, о количестве учителей, учащихся, классов, занимаемых школами зданий. По возможности, следует приложить фотографию школы. Кроме того, австралийским школьникам любопытно узнать о том, какие развлекательные мероприятия проводятся в школе, какие предметы изучаются, есть ли школьная униформа, эмблема школы и девиз. Информацию австралийским сверстникам следует отсылать на английском языке по электронной почте: room8@parkyps.wa.edu.au

Алексей ОРЕШКО

P.S. Если ребят Слонима заинтересовало это предложение, редакция "Газеты Слонімскай" может предоставить доступ к электронной почте. Мы будем ждать вас каждую субботу с 12.00 до 15.00 в здании редакции по адресу: ул. Я. Купалы, д.5.

НАМ ПОСТАВИЛИ УСЛОВИЯ

Представители парламентской "тройки" распространили заявление по итогам визита 5–7 марта в Минск, в котором определены условия, при которых президентские выборы в Беларуси могут быть признаны свободными и демократичными.

Подчеркивается, что свободный и демократичный характер проведения выборов будет рассматриваться в качестве значительного прогресса в процессе демократизации Беларуси, который мог бы способствовать прекращению изоляции страны на международной арене.

Во-первых, как отмечается в заявлении, процесс подготовки и проведения данных выборов должен быть полностью прозрачным и демократичным во всех аспектах, в особенности, в отношении процесса регистрации кандидатов, состава избирательных комиссий и подсчета голосов.

Во-вторых, всем кандидатам должны быть предоставлены равные условия доступа к средствам массовой информации, в частности, к электронным СМИ, и одинаковые возможности организации предвыборной кампании.

В-третьих, все государственные и правительственные органы должны воздержаться от каких-либо действий, которые могут быть квалифицированы, как преследование кандидатов, их родственников или сторонников.

В-четвертых, всем задействованным во внутреннем наблюдении за выборами (особенно в наблюдении не в пользу того или иного кандидата) и в привлечении и подготовке к подобной деятельности, должна быть предоставлена полная свобода действий в этом направлении, включая сотрудничество с международными организациями, которое является важнейшим элементом обеспечения прозрачности и возможности осуществления контроля за избирательным процессом.

Представители парламентской "тройки" продолжают выказывать свою озабоченность в связи с ситуацией с правами человека и отсутствием прогресса в расследовании исчезновений политических оппонентов – Захаренко, Гончара, Красовского, Завадского.

Фота IREX/ProMedia

Глава делегации ОБСЕ Адриан Северин здоровается с лидером БНФ Винцуком Вечеркой перед началом встречи представителей политических партий с Парламентской тройкой ОБСЕ

Парламентская "тройка" "еще раз подтверждает свою полную приверженность улучшению отношений с гражданами Беларуси в рамках процесса укрепления мира и стабильности во всей Европе.

Юрий АЛЕКСЕЕВ

ПРИНЯЛИ РЕШЕНИЕ ЗА "КРУГЛЫМ СТОЛОМ"

Ряд молодежных организаций Гродно принял решение о полной координации своих действий накануне избирательной президентской кампании 2001 года.

Это решение – результат заседания "круглого стола" на тему "Проблемы деятельности молодежных организаций в ходе избирательной кампании", который состоялся в областном центре 9 марта. В нем принимали участие представители "Маладога Фронту", "Маладой Грамады", "Молодежи ОГП", "Альянса имени Витовта Великого", "Свободного профсоюза студентов" и организация "Краявiд". Инициатором мероприятия выступила гродненская организация "Маладога Фронту".

Были обсуждены такие актуальные проблемы, как нескоординированность действий организаций, информационный вакуум, замкнутость активной молодежи в своих организациях и другие. Участники "круглого стола" приняли решение о координации усилий своих организаций по призыву молодежи Гродно участвовать в выборах и по планированию в городе массовых акций. Разработан план совместных мартовских мероприятий. Ближайшими акциями станут общегородские литературные молодежные чтения, антифашистский пикет 18 марта, а также широкое участие в праздновании в Гродно 25 марта Дня Воли.

Павел МОЖЕЙКО

НЕСКОЛЬКО СЛОВ ОБ АМЕРИКЕ

Я много слышала об Америке от своих друзей, которые по разным причинам выезжали на некоторое время в эту страну. Чаще всего это были восторженные повествования о том, чего у нас еще лет так двести уж точно не будет. Слушая их рассказы, я всегда мечтала открыть свою Америку...

Благодаря бюро по делам образования и культуры госдепартамента США, моя мечта на три недели стала реальностью. Правда, не для меня одной, – нас, счастливчиков, было десять. Все – журналисты из разных городов Беларуси. Нас пригласили в Штаты для того, чтобы мы ознакомились с организацией местных газет и управлением средствами массовой информации, чтобы смогли посмотреть, как работают наши коллеги за рубежом, поподробнее разобрать вопросы, касающиеся журналистской этики, новых технологий и т.д.

Мои приключения начались еще в Беларуси, на родной таможне, в аэропорту "Минск-2". В то время, как почти все мои коллеги удачно прошли через таможенный контроль, я никак не могла пересечь "вечно пищащие металлообнаруживающие ворота". Я не понимала, почему они срабатывают на мои хождения вперед-назад – вроде бы никаких металлических вещей на мне и при мне не было... "Может, у вас что-нибудь в карманах куртки лежит?" – поинтересовалась молодая сотрудница таможни. Я засунула руки в карманы и достала свой газовый баллончик. "А он может пищать?" – наивно поинтересовалась я. Однако, таможенница меня уже не слушала, она по рации вызывала охрану аэропорта. "Подождите немного, скоро за вами придут", – сообщила "добрая тетя", совершенно не интересовавшаяся тем, что мой самолет скоро должен был вылетать.

За мной пришел щуплый охранник аэропорта. "Не волнуйтесь, вылетите", – успокоил мужчина, посмотрев на мое мертвецки-белое лицо. Дальше было весело. Он составлял на меня акт об "изъятии у пассажира предметов и веществ, запрещенных к перевозке воздушным транспортом", долго расспрашивал, почему я все-таки решилась перевозить газовый баллончик, и кто это должен был на меня нападать? Сначала я пыталась объяснить, что я всегда ношу с собой это защитное средство, так как чувствую себя увереннее в любых ситуациях. Но охранник не поверил моим объяснениям. Составив акт и пожелав приятного полета, меня отпустили. Так начиналось мое путешествие в Америку.

Все неприятности постепенно стали забываться на борту замечательного Боинга. Сон одолевал всю группу. Перелет был утомительным – около десяти часов до Америки, с пересадкой на другой самолет во Франкфурте. Измученные и сонные, мы прибыли в Вашингтон где-то в восемь часов вечера по местному времени (стоит отметить, что разница во времени с Беларусью составляет где-то минус 7 часов от вашингтонского времени). Было уже темно, поэтому первые впечатления от увиденного мы должны были испытать утром следующего дня. По дороге в гостиницу мы пытались рассмотреть улицы Вашингтона.



Первое, что мне пришло в голову, было то, что наш Минск ничем не отличается от столицы Америки.

